Песняра на дошцы (2017). Галава на ¾ абароты ўлева, з абрысамі плячэй. Твар і шыя злёгку выцягнутыя, лоб высокі, левая скула завостраная. Выразна праглядаюцца нос, вусы. Позірк строгі. Абрысы кашулі, гальштука і пінжака. Памеры: 50 × 50 см. Матэрыял і тэхніка выканання: гіпс; лепка, адліўка, таніроўка. Такі ж скульптурны партрэт быў усталяваны на фасадзе будынка па вул. Мустакілік, 88 (былая вуліца Пушкінская), у якім жыў Якуб Колас з сям'ёй у 1941–1943 гадах падчас эвакуацыі ў Ташкенце [1].

На сучасным этапе сталічнаму літаратурнаму музею Песняра, установе культуры, якая, акрамя папаўнення і захавання фондавых калекцый, плённа вядзе папулярызатарскую і выставачную працу, бракуе скульптуры малых форм як з сюжэтнымі выявамі Якуба Коласа, так і кампазіцый па творах народнага паэта. Скульптура павінна быць кампактнай, зручнай, з адпаведных матэрыялаў для перамяшчэння і, што немалаважна, зразумелай для асэнсавання кожнаму наведвальніку музея і выставачных праектаў.

**Бібліяграфічны спіс**


1. Возвращение Якуба Коласа [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://uzmetronom.agency/2017/05/15/vozvrashhenie_Yakuba_kolasa.html. – Дата доступа: 31.08.2022.
2. Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа. – Асабісты архіў. − Воп. 85. – КП-14254 / Аа-2686.


*УДК 159.923.2:881.161.3*

# КУЛЬТУРА ПЕДАГАГІЧНАГА СУРАЗМОЎНІЦТВА Ў РАЗУМЕННІ ЯКУБА КОЛАСА: АД ВЫТОКАЎ ДА СУЧАСНАСЦІ

**Т. У. Рубанік**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*Мінск, Рэспубліка Беларусь*
*tatyana-rubanik@mail.ru*

У артыкуле разглядаюцца вытокі беларускага рыторыка-педагагічнага ідэалу, асновы якога былі закладзены Якубам Коласам. Праведзены паралелі з сучасным уяўленнем аб культуры педагагічнага суразмоўніцтва, эфектыўных камунікатыўных стратэгіях і тактыках.

*Ключавыя словы:* Якуб Колас; методыка; педагагічнае суразмоўніцтва; рыторыка-педагагічны ідэал; камунікатыўныя стратэгіі і тактыкі; жанры педагагічнай камунікацыі; педагагічны стыль.

# THE CULTURE OF PEDAGOGICAL COMMUNICATION IN THE UNDERSTANDING OF YAKUB KOLAS: FROM THE ORIGINS TO THE MODERNITY

**T. Y. Rubanik**

*Belarusian State University*
*Minsk, the Republic of Belarus*
*tatyana-rubanik@mail.ru*

In the article the origins of the Belarusian rhetorical and pedagogical ideal, the foundations of which were laid by Yakub Kolas, are overviewed. Parallels are drawn with the modern understanding of the culture of pedagogical communication, effective communication strategies and tactics.

*Key words:* Yakub Kolas; methodology; pedagogical communication; rhetorical and pedagogical ideal; communication strategies and tactics; genres of pedagogical communication; pedagogical style.

Цікавасць да стратэгічнага падыходу ў арганізацыі педагагічнага суразмоўніцтва прасочваецца на працягу ўсяго існавання педагогікі і адукацыйнага працэсу. У XXI стагоддзі ад камунікатыўнага майстэрства настаўніка, яго пісьменных і карэктных моўных паводзінаў у розных, часам няпростых, педагагічных сітуацыях залежаць узаемаадносіны з вучнямі, псіхалагічны клімат на ўроку – найважнейшыя ўмовы, якія вызначаюць павышаны інтарэс да вучэбнага прадмета і ўзровень засваення ведаў. Не выпадкова вучоны-лінгвадыдакт М. Г. Яленскі адзначае ў якасці асноўнага кампанента структуры асобы настаўніка моўныя (маўленча-камунікатыўныя) здольнасці.

Звязваючы праблему камунікатыўных зносін у педагагічным працэсе з сучаснай моўнай сітуацыяй у Рэспубліцы Беларусь – беларуска-рускім білінгвізмам, даследчык С. В. Мартынкевіч падкрэслівае, што «ўзмацніўся фактар, цэнтрам якога стаў «чалавек, які гаворыць», яго псіхічны, душэўны стан», а ў лінгвістыцы і лінгваметодыцы на першы план «выходзіць чалавек як моўная, маўленчая, камунікатыўная асоба» [2, с. 114].

Адзначаныя развагі падахвочваюць нас яшчэ раз звярнуцца да вытокаў фарміравання беларускага рыторыка-педагагічнага ідэалу, навуковыя асновы якога былі закладзены ў «Методыцы роднай мовы» Якуба Коласа – дапаможніку для настаўніка.

Якуб Колас (Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч) на старонках гэтай працы абагульняе існуючы замежны і айчынны метадычны вопыт, аналізуе асабістую педагагічную дзейнасць і разам з метадалагічнымі, метадычнымі пытаннямі навучання мове доказна раскрывае ўласнае ўяўленне аб эфектыўным педагагічным суразмоўніцтве.

Следам за псіхолагам Д. Дзюі Якуб Колас размяжоўвае сацыяльнае і інтэлектуальнае выкарыстанне мовы, адзначае, што настаўніку неабходна адрозніваць мову як прадмет выкладання ад мовы як фактару сацыяльных узаемін дзяцей. Толькі ў такім выпадку ён здольны зняць супярэчнасць паміж гэтымі двума бакамі адной і той жа з'явы. Каб прадэманстраваць, наколькі маўленчая сітуацыя ўплывае на камунікатыўныя паводзіны вучняў, Якуб Колас выкарыстоўвае цытату нямецкага лінгвіста Р. Гільдэбранта («Аб выкладанні роднай мовы ў школе»): «Як жыва талкуюць яны на пераменцы або за гульнямі аб тым, што з імі здарылася, як спрачаюцца яны аб крыўдзе і праўдзе, хто вінаваты! Колькі тут красамоўства! І тыя, ад каго ў часе заняццяў трудна дабіцца слова, тут з'яўляюцца першымі прамоўцамі: без усякай запінкі яны знаходзяць усе патрэбныя словы і звароты, у іх ёсць і сінтаксіс і правільна пабудаваныя складаныя выказы, і адною рэччу і пры тым вельмі важнай яны валодаюць у высокай ступені – гэта інтанацыяй, якая дзівіць сваёю правільнасцю, выразнасцю і бясконцай разнастайнасцю. Але вось з'яўляецца настаўнік і пачынаецца лекцыя мовы. Цяпер дзецям прыходзіцца вучыцца гэтай мове, якою яны так добра валодаюць у сваім дзіцячым абыходку, і вучыцца ёй на тым матэрыяле, які для іх зусім не так цікавы, як тое, аб чым яны мінуту таму назад між сабою гутарылі» [1, с. 210]. На прыкладзе супрацьпастаўлення маўленчых сітуацый урока і «перамены» беларускі метадыст абгрунтоўвае, наколькі асоба настаўніка ўплывае на арганізацыю педагагічнай камунікацыі, а яго камунікатыўныя ўменні патрэбны, каб адсочваць камунікатыўную рэакцыю вучняў і падтрымліваць іх зацікаўленасць у час гутаркі.

На думку Якуба Коласа, нельга адкідваць мову дзяцей і падносіць «штучна дастасаваную, кніжную мову падручніка» [1, с. 210], а задача настаўніка заключаецца ў тым, каб «скардынаваць адносіны паміж роднай стыхіяй гаворкі і пэўнымі нормамі літаратурнай кніжнай мовы» [1, с. 211]. Гэта і ёсць рытарычнае майстэрства падладзіцца пад суразмоўцу.

Разглядаючы сінтэтычна-аналітычныя метады, Якуб Колас падкрэслівае значнасць гутаркі аб прадмеце на першым этапе навучання: «Гэта размова-гутарка выклікае зацікаўленасць вучняў, дае некаторыя веды аб прадмеце і прывучае вучняў выказваць свае мыслі» [1, с. 224–225]. Акцэнтуецца ўвага на спецыфіцы жанру педагагічнай гутаркі на ўроках чытання: яна змяшчае дадатковыя «аб'ясненні» і падмацоўвае выхаваўчае ўздзеянне твора на дзяцей (акцэнтуе ўвагу вучняў на галоўных момантах, дапамагае выявіць матывацыю дзейнасці герояў, ацаніць іх учынкі).

Развражанні Якуба Коласа наводзяць на думку аб неабходнасці прытрымлівацца камунікатыўнай стратэгіі блізкасці ў навучальным працэсе, якая мае наступныя характарыстыкі:

«сяброўскі» стыль суразмоўніцтва, зносіны «на роўных», кожны вучань атрымлівае права на прамову, тэмп прамовы ўмераны. Усё адзначанае дапамагае вучням сачыць за рухам думак сваіх таварышаў, а таксама абдумваць самастойнае выказванне; хуткасць змены роляў у гутарцы-размове такая, што дазваляе рэальна ўключыць вучняў у абмеркаванне і залежыць ад асаблівасцей прамовы таго, хто гаворыць, яго ўмення пісьменна і даступна выкласці свой пункт гледжання; у такой гутарцы гучнасць голасу досыць высокая, інтанацыйная палітра разнастайная; жэстыкуляцыя і міміка актыўна выкарыстоўваюцца; настаўніку трэба перамяшчацца па класным пакоі ў жаданні скараціць адлегласць паміж сабою і вучнямі; прытрымлівацца адкрытай паставы; па магчымасці глядзець у вочы вучню, які выказвае свае думкі, а калі гаворыць сам, то пераводзіць погляд з твару на твар, як бы ўключаючы ў абмеркаванне ўсю класную аўдыторыю.

Пацвярджаюць думку аб тым, што Якуб Колас раіць прытрымлівацца камунікатыўнай стратэгіі блізкасці, яго меркаванні наконт зместу і мэты ўступных «заняццяў», якія накіраваны на тое, каб зблізіць настаўніка з вучнямі: «Настаўнік павінен паклапаціцца аб тым, каб школа ў першы ж дзень закранула, захапіла вучня, прыблізіла да сябе. Настаўнік павінен быць добрым, ветлівым гаспадаром, да каторага прыйшлі дарагія госці. Першыя дні заняццяў трэба адвесці на размовы з дзецьмі... Значэнне такіх гутарак зыходзіць з таго, што яны выклікаюць у дзецях цікавасць, развязваюць іх язык, пашыраюць і развіваюць іх вусную мову, памагаюць праясненню і паглыбленню дзіцячага ўяўлення і павялічваюць запас іх слоў» [1, с. 251].

Аналізуючы псіхафізічныя працэсы пры чытанні, Якуб Колас вызначае яшчэ адну камунікатыўную тактыку ў педагагічнай камунікацыі: «Настаўнік не павінен падказваць вучню пры чытанні, бо гэтым затрымліваецца стварэнне «поля чытання» і вядзе вучня да пасіўнасці, і ён не будзе рабіць намаганняў для актыўных зрокавых успрыманняў» [1, с. 239]. Гэта так званая камунікатыўная стратэгія адхілення, сутнасць якой праяўляецца ў тым, што педагог абірае ролю слухача, і ўсе яго камунікатыўныя намаганні накіраваны на актывізацыю самастойнасці вучня.

У раздзеле «Стылістычныя пісьменныя работы» Якуб Колас адзначае, што развіваюць вусную мову і ўменне выказваць свае думкі так званыя «вусныя складанкі» [1, с. 348], якія ажыўляюць «заняцці» роднай мовы. Беларускі метадыст падкрэслівае, што трэба правядзенню «вусных складанак» надаць планавы характар. Вусныя складанні па малюнках, матэрыялах з гісторыі, геаграфіі, прыродазнаўства – гэта «навочныя прадметныя бяседы», рэальная практыка на падставе асабістых уражанняў і назіранняў вучняў. Майстэрскае кіраўніцтва настаўніка, стварэнне добразычлівай атмасферы для такой працы дапамагаюць вучню спакойна падбіраць уласныя словы, прыпомніць кніжныя выразы, каб скласці вуснае паведамленне. Нагадваецца параўнанне з сучаснай камунікатыўнай стратэгіяй «падай выбар», якая патрабуе ад настаўніка ўважлівага слухання, устрымання ад ацэначных меркаванняў і крытычных заўваг. Такая камунікатыўная стратэгія дазваляе разняволіць ініцыятыву навучэнцаў, зняць псіхалагічны заціск, звязаны з бояззю памылак, інакш кажучы, ліквідаваць усё тое, што перашкаджае вучню паўнавартасна адказваць на ўроку. Як бачым, настаўнік павінен валодаць усім стратэгічным арсеналам педагагічнай камунікацыі і выкарыстоўваць адпаведныя камунікатыўныя тактыкі ў залежнасці ад метадаў навучання, псіхафізіялагічных паказчыкаў, індывідуальных асаблівасцей навучэнцаў.

Знаходзім у «Методыцы роднай мовы» таксама парады па арганізацыі педагагічнага дыялогу: «Праз выпытванне і навядзенне настаўнік вызначае сабе, што дзеці зразумелі, а што патрабуе аб’яснення» [1, с. 296]. Выпытванне, або высвятленне, – гэта прамы зварот настаўніка да вучняў, які ажыццяўляецца з дапамогай разнастайных пытанняў. Пытанне – важная складовая частка педагагічнага маўленчага кантакту. Пытальна-адказавы комплекс з’яўляецца нязменным звяном педагагічнага дыялогу. Камунікатыўная функцыя гэтага звяна заключаецца ў тым, што з дапамогай пытанняў і слухання адказаў настаўнік высвятляе веды і ўяўленні (меркаванні, пункты гледжання) вучня.

Якуб Колас акрэслівае патрабаванні да пытанняў настаўніка: «Гэтыя пытанні тады толькі дасягнуць свае мэты, калі яны будуць ставіцца ўмела, дакладна і правільна» [1, с. 295]. Беларускі метадыст сцвярджае, што настаўнік павінен папярэдне абдумваць і кантраляваць

пытанні, вызначае ўмовы вартасці і сэнсу педагагічных пытанняў: дакладнасць, яснасць і прастата; паступовасць; багацце паводле зместу і правільнасць па форме. Перасцерагае Якуб Колас і ад памылак: пытанняў-падказак, закрытых пытанняў, на якія вучні могуць адказаць «так» або «не», дробных (адзін адказ патрабуе пастаноўкі некалькіх пытанняў) або «скупых» па змесце пытанняў, закідвання пытаннямі. Адзначаюцца таксама патрабаванні да адказаў вучня: адпаведнасць пытанням, змястоўнае багацце і правільнасць па форме, паўната. Падкрэсліваецца камунікатыўная культура настаўніка ў час слухання, сутнасць якой – уважлівасць да адказаў вучняў.

Якуб Колас указвае на розніцу паміж пытаннямі і «навядзеннем», вызначае патрэбу ў «навадным» пытанні («калі вучню трудна даць адказ» [1, с. 296]), пералічвае формы «навядзення»: «паказванне прадмета, паўтарэнне чаго-небудзь гаворанага або выпрацаванага на лекцыі, прыпамінанні» [1, с. 296].

У сучаснай методыцы «навадное» (ці дадатковае) пытанне акрэслівае варыянты адказаў і змяшчае інфармацыю, якую настаўнік спадзяецца пачуць ад вучня. «Навадное» пытанне выяўляе ўласцівасці або ўдакладняе дэталі вывучаемай з'явы. Правільна зададзеныя настаўнікам «навадныя» пытанні (звычайна гэта ланцужок пытанняў) падштурхоўваюць разважанні вучня ў патрэбным кірунку і падводзяць да самастойнай фармулёўкі правіла. Псіхалагічны эфект: вучань адказвае на пытанні, правільны адказ атрымліваецца з уласных разваг вучня, такім чынам, павышаецца ўпэўненасць вучня ў сваіх магчымасцях. Педагагічны эфект: «навадныя» пытанні дазваляюць уцягнуць вучня ў дыялог і ўтрымаць яго пры абмеркаванні тэмы на ўроку; вучань не атрымоўвае гатовыя веды, а далучаецца да іх самастойнага пошуку і адкрыцця, што садзейнічае павышэнню зацікаўленасці і больш дасканаламу засваенню матэрыялу.

Разгледжаны Якуба Коласам асноўныя характарыстыкі «аб'яснення» як жанру педагагічнага суразмоўніцтва: «Калі аказваецца патрэбным, настаўнік дае адпаведнае аб'ясненне… Спосабы аб'яснення незразумелых дзецям слоў мяняюцца ў залежнасці ад прычыны неразумення таго ці іншага слова… Усякае аб'ясненне павінна быць кароткім, немнагаслоўным» [1, с. 298]. Падкрэсліваецца, што словы, якія ўжываюцца ў пераносным сэнсе, трэба тлумачыць «цэлымі сказамі» [1, с. 299], таму што «аб'ясненні» мастацкіх выразаў павінны дапамагчы дзецям зразумець галоўную думку і ўвесь твор.

Мастацкае ўвасабленне тэарэтычных ідэй аб культуры педагагічнага суразмоўніцтва знаходзім у трылогіі Якуба Коласа «На ростанях», калі знаёмімся з працай галоўнага героя – настаўніка Андрэя Лабановіча. Павага да вучняў, адступленне ад строгага парадку, імкненне заўсёды падтрымліваць зацікаўленасць і крытычнае мысленне дзяцей – вось асноўныя рысы педагагічнага стылю Лабановіча, які можна кваліфікаваць як дэмакратычны. Якуб Колас тонка раскрывае думкі і перажыванні настаўніка, калі той зрабіў заўвагу вучню і збянтэжыў яго: ці не памыліўся, не пакрыўдзіў хлопца, калі пажартаваў.

Асэнсаванне метадычнага вопыту Якуба Коласа дазваляе з упэўненасцю канстатаваць, што яго ўяўленні аб культуры педагагічнага суразмоўніцтва склалі той падмурак, на якім сёння будуюцца трывалыя і канструктыўныя камунікатыўныя зносіны паміж настаўнікам і вучнямі.

## Бібліяграфічны спіс

1. Колас, Я. Збор твораў: у 20 т. / Я. Колас; НАН Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы. – Мінск: Беларус. навука, 2011. – Т. 15: П'есы. Метадычныя распрацоўкі / рэд. тома Т. С. Голуб; падрыхт. тэкстаў і камент. А. І. Шамякінай. – 791 с.

2. Мартынкевіч, С. В. Маўленчая асоба вучня ў кантэксце сучаснай моўнай сітуацыі / С. В. Мартынкевіч // Аксиология филологического образования в контексте подготовки педагога будущего: материалы междунар. науч.-практ. конф., посвящ. 85-летию со дня рожд. Л. А. Муриной. Минск, 22–23 марта 2021 г. / Белорус. гос. ун-т; редкол.: О. В. Проскалович (гл. ред.) [и др.]. – Минск: БГУ, 2022 [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://elib.bsu.by/handle/123456789/282407. – Дата доступу: 30.06.22.